Беларуская нацыянальная платформа
Форум грамадзянскай супольнасці
УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА

**Заява**

**Беларускай нацыянальнай платформы**
**Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства**

**ў сувязі з падпісаннем Грузіяй, Малдовай і Украінай пагадненняў аб асацыяцыі з ЕС**

*27 чэрвеня 2014 года*

Беларуская нацыянальная платформа Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства вітае гістарычны крок Грузіі, Малдовы і Украіны ў руху да агульнай прасторы Еўрапейскага Саюза. Падпісанне сёння, 27 чэрвеня 2014 года, трыма краінамі Усходняга партнёрства пагадненняў аб асацыяцыі з ЕС у поўным аб'ёме з'яўляецца важнай вяхой у развіцці адносін з нашым агульным суседам — Еўрапейскім Саюзам. Пагадненні аб асацыяцыі адкрываюць для народаў Грузіі, Малдовы і Украіны перспектывы росту эканамічнага дабрабыту, умацавання дэмакратычных інстытутаў кіравання, больш поўнай рэалізацыі правоў чалавека, дасягнення большай сацыяльнай справядлівасці і бяспекі.

Мы спадзяемся, што хуткая ратыфікацыя і паслядоўная рэалізацыя пагадненняў аб асацыяцыі будзе служыць прыкладам для народаў, грамадзянскіх супольнасцей і ўрадаў Беларусі, Арменіі і Азербайджана ў развіцці іх супрацоўніцтва з ЕС і больш поўным выкарыстанні магчымасцей ініцыятывы ЕС «Усходняе партнёрства».

Мы адзначаем, што падпісанне пагадненняў аб асацыяцыі не было б магчымым без таго істотнага ўнёску, які здейсніла грамадзянская супольнасць у развіццё адносін краін-партнёраў з ЕС. Толькі мужныя і самаадданыя дзеянні шырокай грамадзянскай супольнасці Украіны дазволілі захаваць краіне прыхільнасць еўрапейскаму выбару і каштоўнасцям адзінай Еўропы.

Мы шчыра віншуем нашых калег з нацыянальных платформ Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства Грузіі, Малдовы і Украіны, гэтак сама як і нашых калег з арганізацый грамадзянскай супольнасці Еўрапейскага Саюза, з гэтай падзеяй, якая мае важнае сімвалічнае і практычнае значэнне!